УДК 821.161.3'06-31-9«20»

# ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ПРОЗА (НОН-ФІКШН) НА МЯЖЫ XX–XXI стст.: ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

**_Г. Ю. НОВІК_** [1*]

[1*] *Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Даследуецца тэарэтычнае асэнсаванне феномена дакументальнай літаратуры (нон-фікшн) і яго ролі ў сучасным літаратурным працэсе Беларусі. Разглядаецца сінанімічны шэраг тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння дакументалістыкі: «эгадакумент», «літаратура факта», «непрыдуманая літаратура», «літаратура з дамінантным дакументальным пачаткам»; адзначаюцца аўтарскія найменні: «самажыццеапісанне», «летапіс жыцця і творчасці», «літаратура існавання» і інш. Паказаны генезіс нон-фікшн, які ўзыходзіць да росквіту літаратурных салонаў пачатку XIX ст., дзейнасці рускага літаратурнага аб'яднання «ЛЕФ» 1922–1928 гг., амерыканскага журналізму 1960-х гг. На падставе звароту да твораў беларускіх празаікаў мяжы XX–XXI стст. раскрываюцца асноўныя прыкметы літаратуры нон-фікшн. Зроблена выснова пра тое, што нон-фікшн можна разглядаць і як літаратурны метад, і як корпус дапаможных тэкстаў, у якіх няма аўтарскага вымыслу, і як сукупнасць мастацкіх твораў, напісаных з дапамогай адпаведнага метаду. Канкрэтызавана паняцце «нон-фікшн», якое ў працах многіх літаратуразнаўцаў трактуецца абстрактна.

***Ключавыя словы:*** дакументальная літаратура; нон-фікшн; аўтабіяграфістыка; мастацкая літаратура; факт; дакумент.

# ДОКУМЕНТАЛЬНАЯ ПРОЗА (НОН-ФИКШН) НА РУБЕЖЕ XX–XXI вв.: ТЕОРЕТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

**_А. Ю. НОВИК_** [1)]

[1)] *Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Республика Беларусь*

Исследуется теоретическое осмысление феномена документальной литературы (нон-фикшн) и его роли в современном литературном процессе Беларуси. Рассматривается синонимический ряд терминов, которые используются для номинации документалистики: «эгодокумент», «литература факта», «непридуманная литература», «литература с доминантным документальным началом»; отмечены авторские наименования: «саможизнеописание», «летопись жизни и творчества», «литература существования» и др. Показан генезис нон-фикшн, который восходит к расцвету литературных салонов начала XIX в., деятельности русского литературного объединения «ЛЕФ» 1922–1928 гг., американскому новому журнализму 1960-х гг. На основе обращения к произведениям белорусских прозаиков рубежа XX–XXI вв. раскрываются важнейшие жанровые признаки литературы нон-фикшн.

**Образец цитирования:**
Новік Г. Ю. Дакументальная проза (нон-фікшн) на мяжы XX–XXI стст.: тэарэтычны аспект // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. 2017. № 1. С. 17–23.

**For citation:**
Novik H. Y. Non-fiction on the boundary of XX–XXI centuries: theoretical aspect. *J. Belarus. State Univ. Philol.* 2017. No. 1. P. 17–23 (in Belarus.).

**Автор:**
***Анна Юрьевна Новик*** – аспирантка отдела истории белорусской литературы XX–XXI вв. Института языка и литературы имени Якуба Коласа и Янки Купалы. Научный руководитель – доктор филологических наук А. Н. Кислицына.

**Author:**
***Hanna Novik***, postgraduate student at the department of history of Belarusian literature of XX and XXI centuries, the Yakub Kolas and Yanka Kupala Institute of Language and Literature.
*thenameofpear@gmail.com*

Сделан вывод о том, что нон-фикшн можно рассматривать и как литературный метод, и как корпус вспомогательных текстов, созданных без участия вымысла, и как совокупность художественных произведений, написанных с помощью соответствующего метода. Осуществлена конкретизация понятия «нон-фикшн», которое в работах многих литературоведов трактуется абстрактно.

***Ключевые слова:*** документальная литература; нон-фикшн; автобиографистика; художественная литература; факт; документ.

# NON-FICTION ON THE BOUNDARY OF XX–XXI CENTURIES: THEORETICAL ASPECT

***H. Y. NOVIK*** [a]

[a]*The Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus, Surganava street, 1, building 2, 220072, Minsk, Republic of Belarus*

The article is devoted to theoretical understanding of the phenomenon of non-fiction and its role in the contemporary literary process in Belarus. We consider synonymous terms, which are used for the category of documentary – «ego-document», «literature of fact», «uninvented literature», «literature with dominant documentary beginning», and others, including exclusive «self-life-description», «chronicle of the life and work», «literature of existence», etc. It showed the genesis of non-fiction, which dates back to the literary salons of XIX century, Russian literary association «LEF» 1922–1928 years and the American «new journalism» of 1960s. Based on the reference to the works of Belarusian writers of the turn of XX–XXI centuries we reveal the most important genre features of non-fiction literature. Summed findings allow us to consider non-fiction at the same time as the writing method; as a subsidiary body of texts created without the participation of fiction; as a collection of literary works written by said method. Also carried concretization of the concept of non-fiction, which interpreted abstractly by many literary critics.

***Key words:*** documental literature; non-fiction; autobiographical prose; fiction; fact; the document.

Гісторыя развіцця дакументальных уплываў у мастацкай літаратуры сведчыць пра тое, што на мяжы XX–XXI стст. дакументалістыка атрымала не меншае распаўсюджанне, чым літаратура вымыслу. Гэта было дэтэрмінавана перадусім узмацненнем у мастацтве дакументальнага пачатку, якое назіралася пасля трагічных падзей у сусветнай гісторыі, а таксама ў перыяды змены эпох, калі грамадская думка і літаратура звярталіся да новых парадыгм і паўставала неабходнасць экзістэнцыяльнай рэфлексіі.

У выніку ўзнік новы тып літаратуры, якому ўласціва гарманічнае суіснаванне дакументальнага і мастацкага пачаткаў. Сучаснае літаратуразнаўства не выпрацавала адзінага падыходу да тэарэтычнага асэнсавання гэтай з’явы, пра што сведчыць вялікая колькасць тэрміналагічных варыяцый для абазначэння адпаведнага паняцця. Так, у франкамоўных даследаваннях для намінацыі літаратуры такога тыпу выкарыстоўваюцца тэрміны «апавядальная журналістыка» (*journalisme harratif*) і «вялікі рэпартаж» (*grand rapport*), у Нідэрландах распаўсюджана найменне «эгадакумент» (*egodocument*), у краінах СНД часта ўжываецца азначэнне «дакументальная літаратура». Літаратуразнаўца Г. Кісліцына адзначала наступныя тэрміны: «…беларускі варыянт “непрыдуманая літаратура”, рускі – “дакументальная літаратура”, заходнеславянскі – “літаратура факта”, а таксама іншыя – “дакументалістыка”, “нефікцыйная літаратура”» [1, с. 304]. У англамоўных краінах (ЗША, Канада, Вялікабрытанія, Аўстралія) і ў Італіі найбольшай папулярнасцю карыстаецца тэрмін *non-fiction* (англ. *non* ‘не’, *fiction* ‘вымысел; мастацкая літаратура’). У апошнія гады ён стаў актыўна выкарыстоўвацца ў айчынным літаратуразнаўстве як у арыгінальнай, так і ў транслітараванай форме – нон-фікшн.

Найбольш рэлевантнымі для намінацыі новай з’явы, на наш погляд, з’яўляюцца тэрміны, якія выяўляюць шчыльную сувязь мастацкага тэксту з дакументам як матэрыяльным носьбітам зафіксаванай на ім інфармацыі, – «дакументальная літаратура» і «літаратура з дамінантным дакументальным пачаткам». Найменне «нон-фікшн» выступае ў якасці іх сіноніма і падкрэслівае праўдзівую прыроду адпаведнага літаратурнага тэксту. Праз пэўную ступень метафарычнасці мэтазгодна выключыць з сінанімічнага шэрагу аўтарскія дэфініцыі «самажыццяпіс» (А. Цяпа), «летапіс жыцця і творчасці пісьменніка» (М. Мушынскі), «літаратура існавання» (А. Гальдштэйн). Непрыдатнай у якасці тэрміна ўяўляецца і назва «непрыдуманая літаратура», паколькі такая характарыстыка выклікае пытанні наконт эстэтычнасці адпаведных твораў і патрабуе ўдакладнення ступені аўтарскага вымыслу ў іх арганізацыі.

Варта адзначыць, што ўзнікненню феномена нон-фікшн папярэднічала рэалізацыя шэрагу мастацка-культурных з'яў: росквіт літаратурных салонаў і гурткоў першай паловы XIX ст., развіццё рэалізму, французскага натуралізму, дзейнасць рускага літаратурнага аб'яднання «ЛЕФ» у 1922–1928 гг., з'яўленне амерыканскага новага журналізму ў 1960-я гг. і г. д. Калі ў краінах Захаду літаратура нон-фікшн развілася ў значнай ступені пад уплывам новага журналізму, то ў Беларусі яе ўзнікненне абумоўлена зніжэннем цэнзурнага прэса ў 1980–90-я гг. Паступовае знішчэнне калектывісцкіх стэрэатыпаў і ўмацаванне ў мастацтве слова прынцыпаў шчырасці, спавядальнасці, адкрытасці прадвызначылі рост колькасці дакументальных твораў, перадусім аўтабіяграфічнай тэматыкі. Аднак вызначэнне даследчыкамі іх жанравай прыналежнасці як «аўтабіяграфістыка» (А. Астаф'еў), «аўтабіяграфічны жанр» (Л. Лазарук), «аўтабіяграфічная проза» (В. Стральцова, А. Бязлепкіна, Т. Тарасава, С. Сіверска і інш.), «мемуарыстыка» (А. Сідарэвіч, Л. Юрэвіч, М. Улашчык), «мемуарны жанр» (Л. Гаранін) не адлюстроўвае ўсю разнастайнасць сучаснай дакументальнай прозы.

Перш чым даць азначэнне новаму тыпу літаратуры, звернем увагу на яго асобныя рысы, на якія звярталі ўвагу айчынныя і замежныя даследчыкі.

Паводле дэфініцыі Г.-М. Перэ, прыведзенай у энцыклапедыі *Britannica*, проза нон-фікшн – гэта «любая літаратурная праца, заснаваная галоўным чынам на факце, нават калі яна ўтрымлівае прыдуманыя элементы»[1] [2]. Асноўнае прызначэнне такіх твораў – інфармаванне, тлумачэнне. Аднак, паколькі дакументальная проза павінна аказваць эстэтычнае ўздзеянне, то яна не можа атаясамлівацца з высоканавуковым і эрудзіраваным пісьмом. «Слоўнік новых слоў» В. Уласевіч і Н. Даўгулевіч акрэслівае паняцце «нон-фікшн» як «біяграфічны, публіцыстычны твор, дакументальную літаратуру» [3, с. 244].

Большасць даследчыкаў, якія разумеюць пад нон-фікшн прозу, створаную без удзелу вымыслу, пры характарыстыцы тэрміна закранаюць розныя бакі дакументальнай літаратуры. Напрыклад, С. Чупрынін прыводзіць пералік твораў, прыналежных, паводле яго меркавання, да літаратуры з дамінантным дакументальным пачаткам, дзякуючы тэматыка-стылістычнаму аналізу якіх можна скласці ўяўленне пра нон-фікшн: «...сёння гэта і заснаваная на праўдзівых сведчаннях проза Святланы Алексіевіч, і расповед Анатоля Прыстаўкіна пра людзей, прыгавораных да смяротнага пакарання, і па-філасофску выкрышталізаваны "Бясконцы тупік" Дзмітрыя Галкоўскага, і стылістычна ўпарадкаваная напаўнавэлістыка-напаўнарысістыка Уладзіміра Парудамінскага, Ігара Памяранцава, Льва Рубінштэйна, Ігара Клеха, Васілія Галаванава і многіх іншых» [4]. Літаратуразнаўца М. Варыкаша, аналізуючы адметнасці дакументальнай прозы, закранала эстэтычны бок з'явы: «Літаратура *non-fiction* – гэта не фактаграфія і не дакументалістыка, а расповед, які ўспрымаецца на веру. Наяўнасць недакладнасцей ці непраўдзівай інфармацыі ў такіх творах можна вытлумачыць іх прыналежнасцю да мастацтва, якое пакідае за аўтарам права адвольнай інтэрпрэтацыі фактычнага матэрыялу» [5, с. 32]. Даследчыца Н. Іванова падкрэслівала дуалістычную прыроду літаратуры новага тыпу, яе сцверджанне пабудавана паводле прынцыпу выключэння: «*Non-fiction* ёсць усё тое, што не *fiction*, але застаецца ў межах мастацкага пісьма (у межах інтэлектуальна-мастацкага дыскурсу). Я суадношу *non-fiction* з прыгожым пісьменствам – а не проста з кнігамі як такімі, сярод якіх могуць быць і дапаможнікі па матэматыцы, і парады ветэрынара» [6, с. 6–7]. Іншы навуковец, А. Геніс, акцэнтуючы ўвагу на палярызацыі праўды і вымыслу ў літаратуры нон-фікшн, значна пашырае яе жанравыя межы: «Сюды ўваходзяць не толькі навукова-папулярныя сачыненні, філасофскія трактаты, падарожныя нататкі, палітычныя праграмы і кулінарныя рэцэпты, але і, скажам, лірычныя вершы <…> а таксама прыгожае, але небелетрыстычнае пісьменства: эсэ, дзённікі, лісты, гуманітарная проза, уключаючы ўсемагчымыя "раманы-эсэ", "раманы без хлусні"» [7].

Можна заўважыць, што літаратуразнаўцы пры вызначэнні паняцця «нон-фікшн» арыентуюцца на тэматычна-стылістычныя паказчыкі, агульныя для пэўнай сукупнасці твораў, іх жанравую будову, спецыфіку суадносін у такіх тэкстах эстэтычнага і дакументальнага складнікаў, а таксама на шырыню сэнсавага ахопу і генезіс з'явы. У сувязі з неадназначнасцю меркаванняў паўстае неабходнасць канкрэтызацыі паняцця, і найбольш набліжанымі да рэалій яго існавання ў славянамоўных краінах падаюцца высновы А. Местэргазі. Даследчыца вылучае тры сэнсавыя абсягі, характэрныя для нон-фікшн: інтэлектуальная літаратура (тэрмін выкарыстоўваецца пераважна для маркіроўкі небелетрыстычных твораў на кніжных кірмашах); масавая і дапаможная літаратура; літаратура, якая ўзнаўляе рэальнасць без удзелу вымыслу [8, с. 36]. На наш погляд, камерцыйны бок паняцця «нон-фікшн» у айчынных умовах пакуль не развіты, затое праблема сутыкнення інтэлектуальнага і белетрыстычнага (у значэнні так званага лёгкага чытва) у дакументальнай прозе відавочная. Дзякуючы сінтэзу дакументальных і мастацкіх уплываў у літаратуры нон-фікшн цесна спалучаны інфармацыйна-гнасеалагічная і мастацка-эстэтычная функцыі. Такія творы прызначаны перадусім для адукацыі чытача, фарміравання інфармацыйнай

[1]Тут і далей пераклад наш. – *Г. Н.*

дасведчанасці і адначасова эстэтычнага густу. Пэўная ступень займальнасці прыўносіцца ў асобныя тэксты нон-фікшн за кошт белетрызацыі зыходнага фактычнага матэрыялу, таму тэкставы абсяг дакументальнай прозы можа папаўняцца за кошт мадыфікацыі тэкстаў, прыналежных да навуковага і інфармацыйнага дыскурсаў. Аднак адукацыйная скіраванасць дакументалістыкі адмяжоўвае яе ад масавай літаратуры. У сваю чаргу, ад літаратуры дапаможнай нон-фікшн адрозніваецца наяўнасцю элементаў мастацкай літаратуры. На аснове акрэсленых А. Местэргазі сэнсавых абсягаў і сфер прымянення нон-фікшн прапануем наступныя варыянты разумення гэтага феномена:

• метад стварэння тэкстаў на аснове мастацкага пераасэнсавання праўдзівых дакументальных сведчанняў (фактаграфічных ці аўтабіяграфічных) або мадыфікацыі навуковага (гісторыя, літаратуразнаўства) і інфармацыйнага (журналістыка) дыскурсаў пад уздзеяннем белетрызацыі;

• шырокі спектр друкаваных выданняў, створаных без удзелу вымыслу (слоўнікі, даведнікі, навуковыя публікацыі, альманахі, падручнікі, тэзаўрусы, дыяграмы, планы, праекты, фотаздымкі, статуты, аўтарскія кулінарныя кнігі, практычныя дапаможнікі, аналітычныя журналісцкія артыкулы) ці з мінімальным яго выкарыстаннем, напрыклад кнігі «Наша страва» А. Белага, «Беларуская міфалогія» С. Санько, «Гісторыя Беларусі» М. Ермаловіча, «222 альбомы беларускага року» В. Мартыненкі, якія, з аднаго боку, адметныя наяўнасцю аўтарскага стылю, з іншага – з’яўляюцца ўзорам дапаможнай літаратуры;

• уласна літаратурныя творы, напісаныя з дапамогай акрэсленага вышэй метаду. Такія тэксты знаходзяцца на мяжы інтэлектуальнай і масавай літаратуры, напрыклад творы «Крыж на зямлі і поўня ў небе» В. Карамазава, «Жылі-былі класікі» Г. Кісялёва, «Мой радавод да пятага калена» У. Арлова, «Стомленасць Парыжам» Л. Дранько-Майсюка, «З пабачанага і перажытага» А. Барскага, «Масеева кніга» М. Сяднёва, «Займальная літаратура» А. Лойкі і інш.

Паколькі літаратура нон-фікшн аформілася як паўнавартасная эстэтычная з’ява, якая заслугоўвае грунтоўнага аналізу, то ў нашым даследаванні ўвага акцэнтуецца на трэцім падыходзе да разумення гэтага феномена. Паспрабуем канкрэтызаваць паняцце, улічваючы меркаванні іншых даследчыкаў. Такім чынам, нон-фікшн – проза з дамінантным дакументальным пачаткам, якая належыць да інтэлектуальна-мастацкага дыскурсу, выконвае інфармацыйна-гнасеалагічную і мастацка-эстэтычную функцыі. Факты рэчаіснасці, увасобленыя ў выглядзе як афіцыйных дакументаў, так і інтэрв’ю, лістоў, занатаваных асабістых перажыванняў, у такой літаратуры пазначаны аўтарскім суб’ектывізмам і ўводзяцца ў тэкст пры дапамозе прыёмаў прыгожага пісьменства. Нон-фікшн можна ўмоўна дыферэнцыраваць на дзве плыні – аўтабіяграфічную (дзённікі, мемуары, споведзі, лісты, аўтабіяграфіі, травелогі) і дакументальна-мастацкую (мастацкія хронікі, белетрызаваныя біяграфіі, крытыка, фрагментарная проза). Акрамя таго, да прозы з дамінантным дакументальным пачаткам адносяцца такія яе разнавіднасці, як *creative non-fiction* (літаратурна-мастацкая журналістыка) і *pseudo-non-fiction* (містыфікацыі).

На мяжы мастацкай і дакументальнай літаратуры знаходзяцца нарысы, эсэістыка, літаратура «чалавечага дакумента» (так званая вусная гісторыя), інсітнае пісьмо (у тым ліку дзённікі і мемуары, не прызначаныя для друку), а таксама *pseudo-fiction* (цалкам аўтабіяграфічныя творы, напісаныя ў жанрах мастацкай літаратуры). Да нон-фікшн традыцыйна не адносяць мастацкую прозу, паэзію, публіцыстыку, тэксты навуковага дыскурсу, гістарычную і часткова аўтабіяграфічную прозу. Гэта, аднак, не сведчыць пра немагчымасць пранікнення элементаў азначаных разнавіднасцей пісьменства ў дакументалістыку, чаму значна спрыяе рухомасць міждысцыплінарных сувязей, а таксама дынамічнасць меж эстэтычнага, што праяўлялася ў розныя гістарычныя перыяды.

Зыходзячы з сітуатыўнасці выбару жанру, паводле якой тэкст можа належаць (ці не належаць) да літаратуры нон-фікшн у адпаведнасці з тэматыка-стылістычнай напоўненасцю, спосабамі ўзаемадзеяння з мэтавай аўдыторыяй, Д. Марціновіч сфармуляваў шэраг умоў, пры якіх да дакументальнай прозы могуць адносіцца нехарактэрныя жанры і тыпы славеснасці: «Публіцыстыка – калі яна напісаная з апорай на дакументы. Інтэрв’ю – калі яны з’яўляюцца часткай нейкай цэласнай кнігі. <…> Літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства, рэлігійная літаратура – калі ідзе гаворка пра біяграфію пэўнай асобы, гісторыю стварэння пэўнага твора, мастацкай суполкі і г. д.» [9, с. 290]. Улічваючы лабільнасць мяжы паміж мастацкай прозай і нон-фікшн, варта адзначыць дыферэнцыйныя рысы апошняй.

Адна з галоўных прыкмет дакументальнай літаратуры – пабудова твора на аснове праўдзівай інфармацыі, якая ўяўляе сабой зафіксаваныя факты рэчаіснасці. У якасці такіх фактаў могуць выступаць разнастайныя дакументы, лісты, фотаздымкі, справаздачы, архіўныя матэрыялы, а таксама вусныя сведчанні, выслоўі, чуткі, занатаваныя пісьменнікамі. Напрыклад, падчас стварэння кнігі «След матылька. Освальд у Менску» А. Лукашуком былі выкарыстаны рапарты знешняга назірання, дзённікавыя запісы і лісты галоўнага героя, успаміны відавочцаў, аўдыёзапісы, інтэрв’ю і нават кнігі папярэдніх даследчыкаў гэтай тэмы.

Прыналежнасць рэферэнтаў нон-фікшн да рэальнага свету, сама верагоднасць іх верыфікацыі абумоўліваюць парадыгматычныя адносіны паміж адпаведнымі творамі. Гістарычныя падзеі, якія трансфармуюцца ў дакументальны тэкст, паводле вызначэння Н. Мэйлера, «заўсёды маюць больш чым адну версію, і розныя меркаванні часам спаборнічаюць паміж сабой, асабліва калі яны тычацца грамадскіх падзей» [10, p. 47]. Пры гэтым спаборніцтва розных твораў нон-фікшн адбываецца на ўзроўні характараў, а таксама падзейнага і фактычнага зместу. Такія шляхі неўласцівыя мастацкай літаратуры, у якой звычайна ацэньваюцца адметнасці сюжэтнай арганізацыі і спецыфіка стылістычнай манеры аўтара, а не ступень суаднесенасці твора з рэальнасцю.

У адрозненне ад мастацкай літаратуры нон-фікшн прапануе чытачу не гіпатэтычную версію развіцця падзей, а пэўны погляд на рэальныя з'явы рэчаіснасці. У выпадку сутыкнення розных меркаванняў, якія ўзніклі пры пераасэнсаванні рознымі аўтарамі адной і той жа з'явы, чытач мае шырэйшыя магчымасці для ўдасканалення крытычнага мыслення. Відавочна, што інфарматыўная альтэрнатыўнасць у прозе нон-фікшн ажыццяўляецца як праз парадыгматычныя адносіны паміж творамі, так і праз рэалізацыю пісьменнікамі ацэначна-адукацыйных мэт. Так, адметнасці творчага шляху У. Караткевіча чытач можа асэнсоўваць праз прызму ўспамінаў пра класіка яго сучаснікаў, у кантэксце асабістых стасункаў творцы (кніга Д. Марціновіча «Жанчыны ў жыцці Уладзіміра Караткевіча»), а таксама пры звароце да авестыйскай астралогіі (выданне М. Кандратава «У святле астралогіі. Лёсы беларускіх літаратараў»).

Нон-фікшн дакладна вызначае каштоўнасць усіх фактаў незалежна ад іх маштабу ў гістарычным кантэксце і сэнсавага напаўнення. Галоўным чынам такая непераборлівасць выступае адмысловым прыёмам стварэння праўдападобнасці, паколькі кожны момант быцця мае свой сэнс і значнасць.

Для літаратуры з дамінантным дакументальным пачаткам нехарактэрна прэзентацыя чытачу дакумента, не арганізаванага ўнікальным аўтарскім бачаннем, таму праўдзівая інфармацыя, будучы запазычанай з пазатэкставай рэчаіснасці, існуе ў творах нон-фікшн у якасці так званых фактаў-вобразаў. Аўтар пры зборы і аналізе фактычных матэрыялаў, неабходных для аргументацыі, выкарыстоўвае запас асацыятыўных сувязей, закладзеных у яго памяці, сістэмна вывучае здабытыя факты і выбудоўвае гіпотэзы. Праява аўтарскай суб'ектыўнасці назіраецца і ў выбары аб'екта творчасці, пошуку неабходных крыніц. Асабістае меркаванне пісьменніка можа выяўляцца таксама ў падборы фактаў, якія характарызуюць пэўныя гістарычныя падзеі, жыццёвы шлях пэўнага дзеяча ці важную для народа праблему з неўласцівага ракурсу, таму суб'ектыўнасць у дакументальнай літаратуры мае інтэрпрэтатыўны характар. Пра ўвасабленне фактаў у якасці мастацкіх вобразаў пісаў яшчэ Н. Лейдэрман. Навуковец Л. Гаранін падкрэсліваў, што «найбольш тыповай формай існавання дакумента ў літаратуры, паказчыкам яго эстэтычнай самастойнасці і паўнавартаснасці з'яўляецца дакументальны вобраз, менавіта ў ім варта бачыць сутнасць і сапраўднае прызначэнне той ці іншай жанравай структуры» [11, с. 22].

Рэцэпцыя дакументальнай прозы прадугледжвае зварот чытача да ўласных ведаў і кампетэнтнасці ў працэсе чытання, паколькі тэкстуальная інфармацыя накладаецца на ўжо сфарміраванае чытацкае меркаванне адносна той ці іншай з'явы рэчаіснасці. Прычым рэцыпіент мае магчымасць сумнявацца ў слушнасці аўтарскага меркавання. Менавіта сумнеў Э. Хейнэ абірае ў якасці асноўнага крытэрыю вылучэння дакументальнай прозы. У той час як у праўдзівасці мастацкага наратыву сумнявацца бяссэнсава, літаратура нон-фікшн, маючы прэтэнзіі на фактычнасць, іманентна прадугледжвае сумнеў. На думку даследчыка, «калі чытач гатовы сцвярджаць альтэрнатыўны варыянт развіцця падзей, актыўна ўдзельнічаць у пэўнага роду дыялогах, то мы маем справу з нечым, што можа называцца “нон-фікшн”. Калі мы можам гаварыць пра розныя канкурэнтныя гісторыі і калі мы шчыра жадаем выбраць адну з іх, а не дазваляць ім мірна суіснаваць, то мы пакінулі сферу мастацкай літаратуры» [12, p. 330]. Менавіта такім сумневам абумоўлена, напрыклад, палемічнасць кнігі А. Бахарэвіча «Гамбургскі рахунак Бахарэвіча».

У адпаведнасці з умоўнай канцэпцыяй нон-фікшн творчая самарэалізацыя аўтара ў дакументальных тэкстах павінна абмяжоўвацца кампазіцыйным размяшчэннем фактычнага матэрыялу. Як слушна сцвярджае Л. Гінзбург, «для эстэтычнай значнасці не абавязковы вымысел і абавязковая арганізацыя – адбор і творчае спалучэнне элементаў, якія адлюстраваны і пераствораны словам» [13, с. 7]. Жыццёвы факт у прозе нон-фікшн самадастатковы ў мастацкім плане дзякуючы не столькі стылістычным упрыгожанням, знешняй вобразнасці, колькі здатнасці пісьменніка да кампанавання дакументальнага матэрыялу, выбару аптымальнага кампазіцыйнага рашэння. Такая мастацкасць спрыяе захаванню максімальнай праўдзівасці факта. Напрыклад, раман М. Гарэцкага «Камароўская хроніка» ўяўляе сабой не традыцыйны цэласны ў мастацка-стылістычным плане тэкст, а пералічэнне фактаў, аб'яднаных паміж сабой на канцэптуальным узроўні. У якасці важнай адметнасці падобных твораў вылучаюцца мазаічнасць і фрагментарнасць іх кампазіцыйнай будовы. Характэрнай рысай у такім выпадку можа выступаць і адсутнасць сюжэта, які паспяхова замяняецца зафіксаваным рухам самога жыцця.

Некаторыя літаратуразнаўцы, наадварот, падкрэсліваюць важнасць грунтоўнага аўтарскага ўмяшальніцтва ў матэрыял, часам даведзенага да эгацэнтрызму. Балансаванне на мяжы рэальнасці і вымыслу ўласцівае перадусім аўтабіяграфічнай плыні нон-фікшн, дзе вобраз аўтара набліжаны да вобраза апавядальніка і амаль зліваецца з ім. У аўтабіяграфічнай прозе, як сцвярджае В. Стральцова, «пісьменніцкае “Я” зададзена як апавядальная тэма, цэнтр кампазіцыі і сюжэтны стрыжань» [14, с. 53]. Множнасць іпастасей пісьменніка ўспрымаецца натуральна пры ўмове выяўлення ім неардынарнасці мыслення і значнасці яго асобы ў кантэксце літаратурнага працэсу. Таму ў цэнтры ўвагі пэўнага тэксту знаходзіцца не столькі твор і яго персанажы, колькі асоба аўтара. Паводле А. Геніса, аўтар «нам даражэйшы за ўсё, паколькі сёння нас больш хвалюе не ўнікальны твор, а ўнікальнасць творчай асобы, нераскладная сума супярэчнасцей, сабраная ў мастацкай свядомасці, непаўторнасць рэакцый на свет, эксцэнтрычная выключнасць духоўнага вопыту» [7].

Такім чынам, дакументальныя ўплывы ў літаратуры XX ст. выкрышталізаваліся ў самастойную з’яву, якая мае генетычнае дачыненне да метаду вуснай гісторыі і новага журналізму. Найбольш рэлевантнымі для азначэння адпаведнага паняцця выступаюць тэрміны «нон-фікшн» (*non-fiction*), «дакументальная літаратура» і «проза з дамінантным дакументальным пачаткам». Існуюць тры падыходы да разумення гэтай з’явы: нон-фікшн разглядаецца як метад стварэння тэкстаў, шырокі абсяг твораў, напісаных без удзелу вымыслу, і літаратура, створаная пры дапамозе гэтага метаду, якая знаходзіцца на мяжы масавай літаратуры і інтэлектуальнага пісьма. Мы прапануем разумець пад нон-фікшн літаратуру, якая належыць да інтэлектуальна-мастацкага дыскурсу і дзякуючы імпліцытнай ролі аўтара пры арганізацыі дакументальных сведчанняў у паўнавартасны твор выконвае інфармацыйна-гнасеалагічную і мастацка-эстэтычную функцыі. Для літаратуры з дамінантным дакументальным пачаткам у Беларусі характэрны ўмоўны падзел на дзве плыні – аўтабіяграфічную, да якой адносяцца дзённікі, мемуары, споведзі, лісты, аўтабіяграфіі, травелогі, і дакументальна-мастацкую, змест якой складаюць мастацкія хронікі, белетрызаваныя біяграфіі, крытыка, фрагментарная проза і інш. Да нон-фікшн таксама адносяцца такія разнавіднасці літаратуры, як *creative non-fiction* (літаратурна-мастацкая журналістыка) і *pseudo-non-fiction* (містыфікацыі). На мяжы нон-фікшн і мастацкай літаратуры знаходзяцца эсэ, нарысы, вусная гісторыя, інсітнае пісьмо, а таксама цалкам аўтабіяграфічныя творы, напісаныя ў жанрах мастацкай літаратуры. Вылучэнне нон-фікшн як самастойнай эстэтычнай з’явы прадугледжвае наяўнасць у ёй большасці з такіх рыс, як балансаванне на мяжы рэальнасці і мастацтва, набыццё дакументамі і фактамі якасцей мастацкіх вобразаў, прызнанне каштоўнасці ўсіх фактаў, творчая самарэалізацыя аўтара праз кампазіцыйнае рашэнне твора, наяўнасць уласных ведаў чытача пра аб’ект расповеду, замена ў асобных творах праўдзівасці праўдападобнасцю і інш.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Кісліцына Г. М.* Літаратура non-fiction: праблемы атрыбуцыі жанру // Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры (да 90-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі) : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (Мінск, 26–27 лют. 2015 г.). Мінск, 2015. С. 303–306.
2. *Peyre H.* Nonfictional prose [Electronic resource] // Encyclopedia Britannica. URL: https://www.britannica.com/topic/nonfictional-prose (date of access: 17.12.2015).
3. *Уласевіч В. І.*, *Даўгулевіч Н. М.* Слоўнік новых слоў беларускай мовы. Мінск, 2009.
4. *Чупринин С. И.* Non-fiction литература // ЛитМир : [сайт]. URL: https://www.litmir.me/br/?b=105181&p=87 (дата обращения: 05.10.2016).
5. *Варикаша М. М.* Література non-fiction: між фактом і фікцією // Актуальні проблеми слов’янської філології. Сер.: Лінгвістика і літературознавство : міжвуз. зб. наук. ст. Бердянск, 2010. Вип. XXIII, ч. 3. С. 28–39.
6. *Иванова Н.* По ту сторону вымысла // Знамя. 2005. № 11. С. 3–8.
7. *Генис А.* Фотография души. В окрестностях филологического романа // Журнальный зал : [сайт]. URL: http://magazines.russ.ru/zvezda/2000/9/genis.html (дата обращения: 17.12.2015).
8. *Местергази Е. Г.* Литература нон-фикшн / non-fiction. М., 2007.
9. Непрыдуманая літаратура / літаратура нон-фікшн у Беларусі – што гэта? : [круглы стол] // Дзеяслоў. 2015. № 4. С. 278–293.
10. *Lehtimäki M.* The Poetics of Norman Mailer’s Nonfiction: Self-reflexivity, Literary Form, and the Rhetoric of Narrative. Tampere, 2005.
11. *Гаранин Л. Я.* Мемуарный жанр советской литературы : ист.-теорет. очерк. Минск, 1986.
12. *Heyne E.* Where Fiction Meets Nonfiction: Mapping a Rough Terrain // Narrative. 2001. Vol. 9, October (№ 3). P. 322–333.
13. *Гинзбург Л.* О психологической прозе. М., 1999.
14. *Стральцова В. М.* Шлях да сябе: сучасная аўтабіяграфічная проза як мастацкая сістэма. Мінск, 2002.

## References

1. Kislitsyna G. M. Litaratura non-fiction: prablemy atrybucyi zhanru [Literature non-fiction: the problem of attribution of the genre]. *Vechny ruh zhyccja i zakanamernasci tvorchyh poshukaw litaratury (da 90-goddzja z dnja naradzhjennja narodnaga pis’mennika Belarusi akadjemika I. J. Navumenki)* : matjeryjaly rjespublikanskaj navuk.-prakt. kanferjencyi (Minsk, 26–27 Febr., 2015). Minsk, 2015. P. 303–306 (in Belarus.).

2. Peyre H. Nonfictional prose [Electronic resource]. *Encyclopedia Britannica.* URL: https://www.britannica.com/topic/nonfictional-prose (date of access: 17.12.2015).

3. Ulasevich V. I., Dauhulevich N. M. Slownik novyh slow belaruskaj movy [Dictionary of new words of the Belarusian language]. Minsk, 2009 (in Belarus.).

4. Chuprinin S. I. Non-fiction literatura [Non-fiction literature]. *LitMir* : [site]. URL: https://www.litmir.me/br/?b=105181&p=87 (date of access: 05.10.2016) (in Russ.).

5. Varikasha M. M. Literatura non-fiction: pomizh faktom i fiktsieju [Books non-fiction: between fact and fiction]. *Aktual'ni problemy slov'jans'koi filologii. Ser.: Lingvistyka i literaturoznavstvo* : mizhvuzivs'kyi zbirnyk naukovyh statei. Berdjansk, 2010. Issue XXIII, part 3. P. 28–39 (in Ukrainian).

6. Ivanova N. Po tu storonu vymysla [On the other side of fiction]. *Znamya*. 2005. No. 11. P. 3–8 (in Russ.).

7. Genis A. Fotografiya dushi. V okrestnostyakh filologicheskogo romana [Photo of the soul. In the surroundings of the philological novel]. *Zhurnal'nyi zal* : [site]. URL: http://magazines.russ.ru/zvezda/2000/9/genis.html (date of access: 17.12.2015) (in Russ.).

8. Mestergazi Y. G. Literatura non-fikshn / non-fiction [Literature non-fiction]. Moscow, 2007 (in Russ.).

9. Neprydumanaja litaratura / litaratura non-fikshn u Belarusi – shto gjeta? : [krugly stol] [True fiction / non-fiction books in Belarus – what is it?]. *Dzejaslow*. 2015. No. 4. P. 278–293 (in Belarus.).

10. Lehtimäki M. The Poetics of Norman Mailer's Nonfiction: Self-reflexivity, Literary Form, and the Rhetoric of Narrative. Tampere, 2005.

11. Garanin L. Y. Memuarnyi zhanr sovetskoi literatury [Memoir genre of Soviet literature]. Minsk, 1986 (in Russ.).

12. Heyne E. Where Fiction Meets Nonfiction: Mapping a Rough Terrain. *Narrative*. 2001. Vol. 9, October (No. 3). P. 322–333.

13. Ginzburg L. O psikhologicheskoi proze [About the psychological prose]. Moscow, 1999 (in Russ.).

14. Straltsova V. M. Shljah da sjabe: suchasnaja awtabijagrafichnaja proza jak mastackaja sistjema [Way to itself: modern autobiographical prose as an art system]. Minsk, 2002 (in Belarus.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 16.12.2016.*
*Received by editorial board 16.12.2016.*